**Салавей, салавей,птушачка…**

Упершыню ў гісторыі горада складзена самая незвычайная карта.

Уявіце сабе, паважаныя чытачы, наступнае. Глыбокай ноччу, калі самы салодкі сон, некалькі маладых хлопцаў нецярпліва чакаюць тэлефонных званкоў. Ад сваіх каханых? Не, у іх зусім іншае ў галаве: спадзяюцца, што нехта пазвоніць і паведае пра салаўя. І вось «заіграў» мабільнік. «Добрай ночы, — чуецца ўзрушаны



голас. - Каля нашага дома, у зарасніках, чую, як пяе салавей! Ужо больш як гадзіну слухаю яго і нават спаць не хочацца. Запішыце, калі ласка, адрас...»

Што гэта - вясёлы розыгрыш? Не. Хлопец, які прыняў званок, старанна запісвае, так бы мовіць, адрас салаўінай песні, тэлефон абанента, дзякуе яму і чакае далей. Праз некаторы час — чарговае тэлефанаванне пра чарговага салаўя. Потым яшчэ і яшчэ.

Такія вось дзіўныя з'явы адбываюцца сёлета ў Мінску. З самых розных куткоў горада на некалькі тэлефонаў грамадскай арганізацыі «Ахова птушак Бацькаўшчыны» (АПБ) ішлі паведамленні пра салаўёў. Праходзіла незвычайная акцыя па назіранні і ўліку гэтых птушак, аб якой я распытваю спецыяліста па экалагічнай адукацыі АПБ Руслана Шайкіна.

— Руслан, чаму менавіта салавей?

— Цудоўная, непаўторная песня - вось што тут галоўнае. Салавей - адназначна лепшы спявак у птушыным свеце. Кожную вясну ва ўсіх экалагічных садах і парках, лясных масівах з вечара і да раніцы доўжацца салаўіныя канцэрты. Аж да другой палавіны чэрвеня, калі гняздо пакідаюць маладыя салаўі.

Што і казаць, песня салаўя незвычайная. Яна складаецца з асобных строф, ці «кален», як гавораць яе знатакі. «Кален» можа быць дзесяткі. Па іх колькасці вызначаюць лепшых спевакоў.

Яшчэ неабходна адна важная акалічнасць: птушкі могуць жыць толькі ў прыдатных з экалагічнага пункту гледжання мясцінах, такім чынам наяўнасць салаўёў і іх шчыльнасць — добры індыкатар стану навакольнага асяроддзя.

Якія ж задачы ставілі арганізатары акцыі перад тымі, каго заклікалі ўдзельнічаць у ёй? Безумоўна, зазначае Руслан Валянцінавіч не толькі слухаць цудоўныя спевы, мэта больш шырокая, яна мае важнае грамадскае і экалагічнае значэнне: выявіць гэтых птушак як мага больш, дакладна вызначыць месцы іх знаходжання. Прычым не сіламі толькі вучоных, а з дапамогай саміх жыхароў сталіцы.

Разлік такі: калі чалавек нават проста зверне ўвагу на птушку, паназірае за ёю, потым патэлефануе, значыць, яму не ўсё роўна, у якім асяродку жыць.

— Але ж, скажам, гараджаніну не так і лёгка вызначыць: салавей гэта спявае ці якая іншая птушка?

— Песні яго, як высветлілася, знаёмы далёка не ўсім. Таму ў Цэнтральным батанічным садзе Мінска мы наладзілі спецыяльную салаўіную пляцоўку, якая размясцілася ў рады усе спеваў гэтых птушак. Давалі жадаючым біноклі,каб можна было разгледзець птушак, запрашалі ўдзельнікаў задаваць потым пытанні і нават дапамагалі «закачаць» голас салаўя на мабільнікі. Усяго праз такую пляцоўку прайшло звыш паўтары тысячы чалавек. Далей праз СМІ мы запрасілі жадаючых прыняць непасрэдны ўдзел у акцыі. Дастаткова, казалі мы, выйсці вечарам, раніцай або нават у начы на балкон, прыслухацца па дарозе з работы ці спецыяльна зазірнуць у бліжэйшы сквер. І, пачуўшы салаўя, пазваніць па тэлефоне, адправіць ЗМЗ. Прычым у любы час сутак. Вось адкуль і пайшло тое самае начное тэлефанаванне, з якога мы пачалі наш расказ, а потым у тым ліку і паводле тэлефанаванняў была складзена салаўіная карта.

***Р.Шайкин***

**Источник:** Рэсп.-2009.-13 жн.-С.8.